PolotskSU






**а) у Мсціславе; б) у Мінску; в) у Магілёве; г) у Пінску; д) у Крывошыне; е) у Юравічах**
**Малюнак 4. – Храмабудаўніцтва ордэна езуітаў Мінска-Магілёўскага і Палескага рэгіёнаў. Планы касцёлаў.**

УДК 94 (476) «1639»

## КСЁНДЗ і КНЯЗЬ: НЕКАЛЬКІ РАЗВАГ з НАГОДЫ АДНОЙ ПАЗЫКІ РЭКТАРА ПОЛАЦКАГА ЕЗУІЦКАГА КАЛЕГІЎМА ГЖЭГАЖА ГОФМАНА

**Галубовіч В.У.**
Рэспубліка Беларусь, Гродна

*У артыкуле прадстаўлена інфармацыя пра невядомы эпізод жыцця ў Полацку рэктара мясцовага езуіцкага калегіўма Гжэгажа Гофмана. Гофман кіраваў навучальнай установай у 1638-1640 гг. За гэты кароткі перыяд ён наладзіў рознабаковыя адносіны з мясцовымі жыхарамі, у тым ліку, шляхтай. Унікальны характар маюць выяўленыя звесткі пра заключэнне ў 1639 г. Гофманам дамовы аб пазыцы грошай прадстаўнікам мясцовага княжацкага роду Друцкім Саколенскім. Ажыццяўленне такой грашовай аперацыі сведчыць пра стабілізацыю фінансавага становішча полацкіх езуітаў, павелічэнне сродкаў іх уплываў на Полаччыне.*

***Ключавыя словы:*** *Полацкі езуіцкі калегіум, Гжэгаж Гофман.*

PolotskSU



Зыходнай падставай гэтых кароткіх нататак стала знаходка ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі дакумента, які дазваляе крыху адыйсці ад зададзенай у апошнія дзесяцігоддзі беларускай гістарыяграфіяй культуралагічнай парадыгмы ўспрымання езуіцкага ордэна як пераважна асветніцкай, адукацыйнай установы. Жыццё езуіцкай калоніі ў Полацку складалася не толькі з барацьбы за веру праз пашырэнне ведаў, хаця гэты аспект быў галоўным, але і з іншых форм камунікацыі, якія не маюць прамога дачынення да рэлігіі. Заснаваны ў 1580 г. калегіўм быў часткай гаспадарчай інфраструктуры Полаччыны, а канцэнтрацыя значнай зямельнай уласнасці, улады і сродкаў дазваляла езуітам уздзейнічаць на мясцовых жыхароў не толькі абапіраючыся на духоўны аўтарытэт. Уласна ілюстрацыяй матэрыяльных форм узаемадзеяння езуітаў з палачанамі з’яўляецца дадзены матэрыял.

*Форма і змест дакумента.* У складзе адзінак захоўвання НГАБ з былога Нясвіжскага архіва Радзівілаў знаходзіцца стракаты па змесце рукапісны зборнік, які ўтрымлівае шэраг матэрыялаў, датычных мінулага Полаччыны. Сярод іх апынуўся невялікі, фактычна на двух аркушах, дакумент, напісаны на польскай мове. Ён уяўляе сабой ненатарыяльнае грашовае абавязацельства Багдана і Гальшкі Друцкіх Саколенскіх, засведчанае іх подпісам, пячаткай Багдана, а таксама подпісамі і пячаткамі трох сведкаў [1].



**Малюнак 1. – Пячатка Багдана Друцкага Саколенскага.**
**Герб: На тарчы выява ўласнага герба князёў Друцкіх – “Друцк”, па сярэдзіне поля меч, лязом уніз, з бакоў месяцы, звернутыя рагамі да сябе.**
**Ініцыялы: над тарчай зверху размешчана абрэвіятура “BDS”, якая абазначала імя ўладальніка пячаткі: *“B [ogdan] || D [rucki] || S [okolinski]”.***
**Крыніца: НГАБ у Менску. Фонд 694. Вопіс 4. Спр. 956. Арк. 221.**

З тэкста дакумента вынікае, што ў Полацку 3 чэрвеня 1639 г. у прысутнасці сведкаў полацкія зямяне Багдан і Гальшка Друцкія Саколенскія пазычылі ў рэктара Полацкага езуіцкага калегіўма Гжэгажа Гофмана 700 польскіх злотых. Друцкія матывавалі пазыку патрэбай у грошах, якія абяцалі вярнуць акуратна ў вызначаны час, “*не адхіляючыся ад таго дня і году*” і на пэўным месцы: 30 лістапада 1639 г. у будынку калегіўма [1, Арк. 220]. Фактычным зместам гэтага дакумента з’яўляецца дамова аб безадсоткавай пазыцы грошай, што выключае магчымасць западозрыць рэктара ў спробе ліхвярства.

*Асаблівыя і форсмажорныя абставіны.* Па сваёй сутнасці дакумент з’яўляецца гарантыйным абавязацельствам, якое можна было выкласці ў некалькіх радках, але гэтага было недастаткова. Галоўны сэнс гэтай паперы заключаўся ў падрабязным апісанні ўмоў, якія гарантавалі вяртанне рэктару грошай. Большую (дзве траціны тэксту) частку ліста займае пералік варыянтаў кампенсацыі ў выпадку несвоечасовай выплаты альбо ўвогуле невяртання грошай Г. Гофману.

Паводле заключанай дамовы несвоечасовае вяртанне сумы азначала падваенне доўгу, і Друцкія Саколенскія абавязваліся аддаць 1400 злотых плюс кампенсаваць усе судовыя выдаткі, звязаныя з адпаведнымі працэдурамі. Гарантыйны ліст даваў Г. Гофману неабмежаваныя правы па выбару інстанцыі, праз якую ён мог спаганяць свае грошы: рэктар мог звяртацца ў любы павятовы земскі і гродскі суд альбо ў Галоўны суд ВКЛ.

Каб выключыць усе магчымыя выслізванні з абавязкаў, Багдан і Гальшка Друцкія Саколенскія абмовіліся, што яны не будуць ухіляцца ад выплаты “*ніякім прычынам і без ўжывання метадаў, апісаных у Статутах і канстытуцыях для нашай дапамогі служачых*”. Дэтальна гэта азначала фіксацыю наступных абяцанняў: не адтэрміноўваць справу, калі б яна трапіла ў суд, не пераводзіць працэс у іншы суд, не ўхіляцца ад вяртання пазыкі па розных прычынах, у тым ліку з-за хваробы ад “*паветрыя моравага*”, выканання Багданам пасольскіх (у выпадку прызначэння паслом “*да Яго Каралеўскай Міласці і Рэчы Паспалітай*”) і вайсковых функцый [1, Арк. 220 адв.].

Грошы былі пазычаныя на кароткі тэрмін (крыху менш, чым на шэсць месяцаў), але і гэтага было дастаткова, каб уключыць у гарантыйны ліст, ці, ужываючы саманазву, у “*ліст дабравольны*”, гарантыі выплаты нават у выпадку смерці княжацкай пары. Багдан і Гальшка абяцалі рэктару вярнуць пазыку са сваёй маёмасці, “*рухомай і нерухомай*”. Зрабіць гэта належала нашчадкам альбо сваякам і апекунам, якія будуць распараджацца ўласнасцю. На жаль, у дакуменце не было пазначана, з якіх маёнткаў належала выбіраць грошы, а пералік рухомай уласнасці быў фармалізаваны. з апошняй дазвалялася прадаваць усё, што “*заставалася*”, пачынаючы з найбольш каштоўнага: золата, срэбра, цыны (волава), медзі, вопраткі, зброі, коней і быдла [1, Арк. 220 адв.].

PolotskSU



Пазычаная ў рэктара сума была дастаткова вялікай нават у памерах прыбыткаў, забяспечаных па тых часах асоб. Параўнаць яе можна з гадавым заробкам дзяржаўнага ўрадніка высокага ўзроўню. Напрыклад, штогадовы прыбытак вялікага пісара ВКЛ складаў 1000 злотых [2, s. 30, 40]. Што датычыцца Друцкіх Саколенскіх, то прычыны пільных патрэб маглі быць самыя розныя, але сям'я гэта да павятовай беднаты не належала, хаця, магчыма, і мела часовыя фінансавыя праблемы. Сам Багдан быў спадчыннікам уласнасці па бацьке і браце Аляксандры, а прададзены ім у 1642 г. маёнтак Павулле каштаваў 22 000 злотых [3, s. 481]. Продаж асобных частак яго маёмасці прынеслі князю Багдану салідныя грошы: у 1665 г. амаль 10 000 злотых за часткі зямель у Гарадчэвічах, Людчыцах і Таранковічах [4, s. 64].

*Удзельнікі дамовы.* Дакумент быў складзены ад імя ***Багдана і Гальшкі Друцкіх Саколенскіх***. Асобы гэтыя вялікай славы ў гісторыі не здабылі, але незаўважнымі не былі ўжо з таго пункта гледжання, што належалі да вядомага княжацкага роду, дакладней, да яго полацкай галіны. Багдан быў шостым і наймалодшым сынам князя Міхаіла Міхайлавіча Саколенскага, полацкага ваяводы ў 1613-1621 г., перад самай смерцю ў 1621 г. прызначанага смаленскім ваяводай [3, s. 480-481]. Урадніцкай кар'еры нават на павятовым узроўні ***полацкі ваяводзіч*** не зрабіў [5] і вядомы пераважна як удзельнік розных маёнткавых працэсаў. Паводле Ю. Вольфа, ён мог жыць яшчэ ў 1677 г. Жонка Багдана, Гальшка, паходзіла з роду Азрынскіх і звычайна выступала ў працэсах нароўні са сваім мужам [3, s. 481-482]. Друцкія Саколенскія мелі, прынамсі, адно дзіця, згаданага ў падымным рэестры Полацкага ваяводства 1667 г. сына Казіміра, памёрлага ў 1667 г. [4, s. 44]. Адметна, што Друцкія Саколенскія ў гарантыйным абавязацельстве Г. Гофману пазбягаюць ужывання княскага тытула, што, відаць, было вынікам як збяднення роду, так і рэхам, а не патрабаваннем, ідэі роўнасці шляхты, што замацоўвалася ў тагачасным заканадаўстве, напрыклад, у соймавай канстытуцыі 1638 г. "*Пра іншаземныя тытулы*" [6, s. 441-442].



**Малюнак 2. – Подпісы Багдана і Гальшкі Друцкіх Саколенскіх.**
**Крыніца: НГАБ у Менску. Фонд 694. Вопіс 4. Спр.956. Арк. 221.**

Пазычальнікам грошай полацкім зямянам-князям Друцкім Саколенскім выступіў згаданы рэктар Полацага езуіцкага калегіўма Гжэгаш Гофман. Пра гэту асобу вядома не шмат. ***Гжэгаш Ежы Гофман*** (каля 1597-1668 гг.) паходзіў з Жамойці, і ўжо ў 1614 г. стаў сябрам ордэна езуітаў. Яго з'яўленню ў Полацку папярэднічала выкладчыцкая кар'ера, у тым ліку ён з'яўляўся прафесарам Св. Пісання (1631-1633 гг.) і маральнай тэалогіі (1636 г.) у Віленскай акадэміі, а таксама кіраўніком навучальнай установы: 1637-1638 гадах Г. Гофман быў рэктарам Нясвіжскага езуіцкага калегіума. Па невядомых прычынах, г. зн., не адпрацаваўшы звычайны трохгадовы тэрмін, ужо ў 1638 г. ён апынуўся ў Полацку і ўзначальваў мясцовы калегіўм да 1640 г. [7, s. 218]. Цікава, што пасля 1640 г. Г. Гофман знікае больш чым на дзесяцігоддзе з поля зроку гісторыкаў [7, s. 218]. Малавядомым з'яўляецца датаваны 1655 г. факт яго рэктарства ў пінскім калегіўме [8, s. 34].

Гжэгаш Гофман быў для мясцовай полацкай публікі чалавекам новым, як зрэшты і іншыя тагачасныя рэктары, якія ў Полацку мяняліся рэгулярна. Тым не менш, ужо на наступны год кіравання калегіўмам ён выступае ў якасці пазычальніка грошай. Відавочна, што гэта сума паходзіла з асабістых сродкаў рэктара, які, прынамсі, як кіраўнік не павінен быў мець нейкіх матэрыяльных праблем. Фармальна гарантам гэтага былі прыбыткі самога Полацкага езуіцкага калегіўма, які атрымаў шчодрае забеспячэнне яшчэ ад Стэфана Баторыя. Праўда, на практыцы сітуацыя езуітаў не заўсёды выглядала найлепшым чынам. Так, у 1587 г. сумарны гадавы прыбытак мясцовых езуітаў склаў толькі 800 злотых (!), што прымушала манархаў, у прыватнасці, Жыгімонта Вазу, фінансава падтрымліваць калегіўм [9, s. 9-10]. Аднак у другой палове 1630-х гадоў становішча ўстановы было аб'ектыўна іншым у выніку руплівай дзейнасці саміх айцоў [9, s. 10], якія павялічвалі свае ўладанні [10, с. 118]. Паводле інвентарнага апісання 1623 г., калегіяльная ўласнасць складалася з трох мястэчак і 86 вёсак [10, с. 119]. У канцы XVII ст. калегіўм як уласнік меў найбольшую колькасць дымоў у Полацкім ваяводстве пасля Людвікі Караліны Радзівіл, уласніцы Невеля [4, s. 81,133]. Стабільнае фінансавае становішча ператварала Полацкую калегію ў *важнейшую гаспадарчую і фінансавую ўстанову*, якая фактычна магла не толькі самафінансаваць сваю дзейнасць, але і выконваць іншыя эканамічныя функцыі, *у тым ліку, банкаўскага характару*. Такім чынам, Друцкія Саколенскія ведалі, да каго трэба звяртацца па беспрацэнтны крэдыт, а рэктар Гофман, напэўна, не аддаў бы ім апошняе.

*Сведкамі*, але не гарантамі вяртання Друцкімі Саколенскімі грошай былі "*шаноўныя людзі*" – паны ***Стэфан Казерскі, Пётр Булгак і Якуб Майлевіч*** [1, Арк. 221]. Цяжка сказаць, на чым грунтаваўся выбар менавіта гэтых асоб у якасці "*вусна запрошаных пячатараў*", тым больш, што яны, відавочна, не належалі да мясцовай шляхты, прынамсі, яе эліты.

*Высновы.* Панарама мінулага заўсёды складаецца з асобных фрагментаў, якія далёка не заўсёды можна адразу сабраць, таму для рэканструкцыі гісторыі кожны асобны факт мае сваю значнасць. Тым большую каштоўнасць маюць

PolotskSU



унікальныя звесткі, якія часам з'яўляюцца адзіным сведчаннем прысутнасці чалавека ў пэўным часе і месцы. На жаль, амаль нічога не вядома пра дзейнасць у Полацку Гжэгажа Гофмана як рэктара, але захаваліся сведчанні аб яго сацыяльных кантактах, не звязаных з выкладчыцкай працай. Уласна гэта інфармацыя і мае найбольшую каштоўнасць, паколькі яна ілюструе ступень і шматпланавасць інтэграцыі езуітаў у жыццё мясцовага грамадства.

**Спіс выкарыстаных крыніц**
1. НГАБ у Менску. Фонд 694. Вопіс 4. Спр.956. Арк. 220-221 адв.
2. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. Archiwum Radziwiłłów. Dział II. Sygn. №. 1211. S. 1-77.
3. Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku. – Warszawa: Drukiem J. Filipowicza, 1895. – 724 s.
4. METRYKA LITEWSKA. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo połockie 1667 i 1690 r. Opracowali Henryk Lulewicz i Andrzej Rachuba. – Warszawa: Instytut Historii PAN, 2018. – 182 s.
5. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV-XVIII wieku : spisy. – T. V. Ziemia Połocka i województwo Połockie XIV-XVIII wiek. / pod red. Henryka Lulewicza. – Warszawa: IH PAN, 2018. – 306 s.
6. Volumina legum. T. III. Petersburg: Nakladem i drukiem Jozafata Ohryzki; 1859. 472+ XV s.
7. Encyklopedia wiedzy o jezuitach na ziemiach Polski i Litwy 1564–1995 / oprac. L. Grzebień. – Kraków : Wyd-wo WAM, 1996. – 882 s.
8. Wisner, H. Najjaśniejsza Rzeczpospolita. Szkice z czasow Zygmunta III i Władysława IV Wazy. – Warszawa: Wydawnictwo NERITIN, 2001. – 144 s.
9. Materyały do dziejów Akademii Połockiej i szkół od niej zależnych / Zebrał I.G. – Kraków: Druk W.L. Antyca i spółki, 1905. – 288 s.
10. Мараш, Я. Н. Ватикан и католическая церковь в Белоруссии (1569–1795) / Я. Н. Мараш. – Минск : Вышэйшая школа, 1971. – 272 с.

**PRIEST AND PRINCE: A FEW COMMENTS ON THE OCCASION OF GRZEGORZ HOFFMANN, THE RECTOR OF THE POLOTSK JESUITIC COLLEGE, LENDING**

V. HALUBOVICH

The article presents information about an unknown episode in the life of the rector of the local Jesuitic college Grzegorz Hoffmann in Polotsk. Hoffman led the college in 1638-1640. During the short period of time he established a diverse relationship with the locals, including the gentry. The information about concluding the agreement on lending money to representatives of the local princely family of Drutsky Sakolensky by Hoffmann in 1639 has a unique character. The implementation of such a monetary operation indicates the stabilization of the Polotsk Jesuits financial position, an increase of the means of their influence in the Polotsk district.
***Key words:*** Polotsk jesuitic college, Grzegorz Hoffmann.

УДК 272-9«17»:94:378.4(430)«17»

## ИЕЗУИТЫ И НЕМЕЦКИЕ УНИВЕРСИТЕТЫ

**Келлер О.Б.**
Республика Беларусь, Минск
Федеративная республика Германия, Тюбинген

*На сегодняшний день известно, что во многих немецких университетах в Раннее Новое время преподавали иезуиты: в Бамберге, Вюрцбурге, Гейдельберге, Диллингене, Ингольштадте, Кёльне, Майнце, Мольсхайме, Оснабрюке, Падерборне, Трире, Фрайбурге, Эрфурте.*
*В статье д.и.н., профессора Келлер О. Б. речь будет идти о роли иезуитов в немецких университетах: о том, когда иезуиты впервые появились в Германии; какие позиции занимали в немецких образовательных структурах; какие свои «иезуитские университеты» основали на немецких землях и пр.*
*Первым иезуитом, появившимся на немецких землях, считается Пьер Эмиль Лазар Фавр. Произошло это в 1540 г. С тех пор в Германии появилось много иезуитов, наложивших свой отпечаток на историю этой страны. А вот какую именно роль сыграли представители «Общества Иисуса» в образовательной жизни страны, можно будет узнать, ознакомившись с данным материалом, базирующимся на солидных исследованиях немецких ученых по данной проблематике.*
***Ключевые слова:*** *иезуиты, первые иезуиты на немецких землях, роль иезуитов в немецких университетах, от лекций до руководства кафедрами и факультетами, университеты духовной элиты, университеты светской элиты, немецкие иезуитские университеты.*

**Первые иезуиты на немецких землях.** 24 октября 1540 г. в немецком городе Вормсе вместе с дипломатом императора Петром фон Оритцем появляется первый иезуит Пьер Эмиль Лазар Фавр (13.04.1506–01.08.1546) [1, с. 4]. Долгое время считалось, что Пьер Фавр принимал участие в религиозных диспутах и дискуссиях 1540 г. в Вормсе, дабы целенаправленно и в соответствии с намерением Игнатия Лойолы «внести иезуитский дух в страну зарождения ереси» [2, с. 5]. Однако, в настоящее время учёные полагают, что на самом деле его пребывание в Вормсе, а впоследствии и в городах Шпайер и Регенсбург носили эпизодический характер. На самом деле Пьер Фавр ожидал отправления в запланированную поездку в Испанию, в которую Петр фон Оритц и Пьер Фавр отправляются 27 июля 1541 г. [1, с. 6].

Точно также, не совсем запланированно, – по мнению современных исследователей, – выглядело и второе прибытие Пьера Фавра на немецкие территории [3, с. 81]. Когда Пьер Фавр, присланный Папой Римским Павлом III (в миру – Алессандром Фарнезе) вместе с двумя другими членами «Ордена иезуитов» – Клодом Ле Джэем (1504-1552) [1, с. 15-24] и Ни-

PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ: ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А.І. Корсак;
канд. гіст. навук В.У. Чараўко;
канд. гіст. навук, дац. У.Я. Аўсейчыка

Наваполацк
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
2021

PolotskSU

УДК 343.13(063)
ББК 67.410.2я431

Рэкамендаваны да выдання саветам гуманітарнага факультэта
Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 3 ад 29.03.2021)

*Рэдакцыйная калегія:*

*А.І. Корсак,* канд. гіст. навук, дац. (адк. рэд.), заг. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*В.У. Чараўко,* канд. гіст. навук, дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*У.Я. Аўсейчык,* канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Рэцэнзенты:*

*С.В. Кулінок,* канд. гіст. навук, заг. аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь;
*Т.А. Джумантаева,* канд. культуралогіі, дац., дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў :** зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – 272 с.
ISBN 978-985-531-737-2.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы V міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў”. Прадстаўлены вынікі антрапалагічных і археалагічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, археолагаў, этнолагаў, антраполагаў, мастацтвазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, краязнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 343.13(063)**
**ББК 67.410.2я431**

**ISBN 978-985-531-737-2**

© Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2021

PolotskSU

*Навуковае выданне*

**БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:
ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ
І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Адказны рэдактар *А. І. Корсак*

Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка
*І. М. Чапкевіч*
Дызайн вокладкі *М. С. Мухаморавай*

Падпісана да друку 20.05.2021. Фармат 60×84 1/8. Бумага афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 31,63. Улік.-выд. арк. 32,96. Тыраж 70 экз. Заказ 810.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вырабніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 08.05.2014.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.